ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 4 (733) ● Пятніца, 7 лютага 1969 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXII



## ДОБРЫ ДЗЕНЬ, ДРУГІ СЕМЕСТР!

Мінула гарачая пара зімовай экзаменацыйнай сесіі. Праляцелі радасныя дні канікул з вясёлымі падарожжамі і складанымі турысцкімі маршрутамі, з цікавымі сустрэчамі і прыемным адпачынкам.

Кароткае зацішша ва універсітэце зноў змянілася рознагалосым студэнцкім гоманам. Ажылі аўдыторыі, бібліятэкі, лабараторыі і кабінеты.

Добры дзень, другі семестр!



# НАША ГОРДАСЦЬ

## Новае папаўненне Акадэміі навук БССР

Як паведамлялася ў друку, два дні — 21—22 студзеня — ў Мінску праходзіла сесія агульнага сходу Акадэміі навук БССР. На гэтым навуковым форуме адбыліся выбары акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН БССР.

З задавальненнем можна адзначыць, што сярод выбраных у члены-карэспандэнты ёсць і вучоныя Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, вядомыя ў нашай краіне сваімі навуковымі адкрыццямі, поспехамі ў падрыхтоўцы дастойнай змены даследчыкаў і педагогаў.

Сярод выбраных у члены Прэзідыума АН БССР — акадэмік АН БССР, рэктар універсітэта прафесар Антон Нікіфаравіч Сеўчанка. Вялікія яго заслугі ў развіцці беларускай савецкай фізічнай навукі. Адзін з вучняў Сяргея Іванавіча Вавілава, ён пераняў у свайго настаўніка не толькі пастаяннае імкненне да ўдасканалення сваіх ведаў, распрацоўкі новых праблем фізікі, але і пачуццё вялікай адказнасці за падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў. Калі ў 1952 годзе Антон Нікіфаравіч быў запрошан ЦК КПБ на работу ў Мінск, у Беларусі не было ніводнага доктара фізіка-матэматычных навук і толькі сем фізікаў мелі вучоную ступень кандыдатаў навук. Прафесар выхаваў шматлікі калектыў не толькі оптыкаў вышэйшай навуковай кваліфікацыі, але і цэлы атрад вучоных самых разнастайных сумежных з фізікай галін навукі. Яго вучні працуюць ў Акадэміі навук БССР і яе інстытутах, ва універсітэце і іншых навучальных установах краіны.

Членам-карэспандэнтам АН БССР выбран доктар фізіка-матэматычных навук, прарэктар па навуковай рабоце прафесар Леанід Вікенцьевіч Валадзько. Гэта высокакваліфікаваны, усебакова развіты навуковы работнік. Ім надрукавана каля 50 навуковых прац, чатыры яго вучні абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Лекцыі па курсах «Агульная фізіка», «Будова малекул», якія ён чытае на фізічным факультэце, вылучаюцца высокім узроўнем, абгрунтаванасцю вывадаў, даходлівасцю. Л. В. Валадзько арганізаваў на кафедры новы практыкум па оптыкатэхніцы і паспяхова кіруе групай студэнтаў, якія навучаюцца па гэтай спецыяльнасці. Сам буйны даследчык, ён аказвае вялікую дапамогу аспірантам, супрацоўнікам кафедр у вырашэнні складаных навуковых праблем. Паспяховую навукова-педагагічную работу Леанід Вікенцьевіч Валадзько ўмела спалучае з актыўным удзелам у грамадскім жыцці універсітэта і рэспублікі.

Каля сарака год у вышэйшых навучальных установах Беларусі працуе доктар філасофскіх навук прафесар Іван Мікалаевіч Лушчыцкі. У 1930 годзе ён скончыў наш універсітэт, а праз чатыры гады атрымаў вучоную ступень кандыдата навук. Цяпер ён узначальвае кафедру гісторыі філасофіі і логікі. Гэта адзін з вядучых вучоных-філосафаў, які палажыў пачатак даследаванню грамадска-палітычнай і філасофскай думкі беларускага народа. І. М. Лушчыцкі надрукаваў звыш 60 навуковых прац, у тым ліку манаграфіі «Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі ў другой палове XIX века», «Савецкая дзяржава ў перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізма», а таксама шэраг работ па важнейшых пытаннях камуністычнага будаўніцтва ў СССР. Ён падрыхтаваў 35 кандыдатаў навук і два дактары навук, звыш 50 разоў выступаў апанентам па доктарскіх і кандыдацкіх дысертацыях. Член КПСС з 1926 года, актыўны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, буйны даследчык і выдатны педагог, ён узнагароджан ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза, у тым ліку ордэнам Леніна, дзвюма Ганаровымі Граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР. Прафесар Іван Мікалаевіч Лушчыцкі выбран членам-карэспандэнтам Акадэміі навук БССР.



Членам-карэспандэнтам АН БССР выбран доктар хімічных навук прафесар Рыгор Лазаравіч Старобінец. Яго імя ўжо многа год звязана з нашым універсітэтам. Тут ён прайшоў шлях ад асістэнта да прафесара. Чытаў лекцыйныя курсы па хімічнай тэрмадынаміцы, электрахіміі, хімічнай тэхналогіі, фізічнай і аналітычнай хіміі, фізіка-хімічнаму аналізу.

Вядомы вучоны і педагог, Р. Л. Старобінец унёс вялікі ўклад у развіццё хімічнай навукі. Ен аўтар больш 100 навуковых работ, цэлы шэраг якіх ўяўляе практычны інтарэс.

Нямала сіл і працы аддае Рыгор Лазаравіч удасканаленню навучальнага працэсу, падрыхтоўцы маладых спецыялістаў высокай кваліфікацыі. Пад яго кіраўніцтвам плённа займаецца таленавітая моладзь, якая ўдзельнічае ў распрацоўцы складаных праблем, паспяхова абараняе кандыдацкія дысертацыі і папаўняе рады беларускіх вучоных.

По спецыяльнасці матэматыка членам-карэспандэнтам АН БССР выбран малады вучоны універсітэта доктар фізіка-матэматычных навук прафесар Уладзімір Пятровіч Платонаў. Прайшло нямногім больш сямі год, як ён скончыў матэматычны факультэт БДУ. Праз два гады—кандыдат навук, а яшчэ праз тры дваццацішасцігадовы даследчык бліскуча абараняе доктарскую дысертацыю на тэму «Тапалагічныя і алгебраічныя групы» ў Інстытуце матэматыкі Сібірскага аддзялення АН СССР.



У. П. Платонаў з'яўляецца таленавітым вучоным-матэматыкам з шырокім колам навуковых інтарэсаў, якія характарызуюцца вялікай актуальнасцю. Асноўныя навуковыя даследаванні У. П. Платонава адносяцца да трох сучасных абласцей матэматыкі на стыку алгебры, тапалогіі і алгебраічнай геаметрыі—тапалагічныя групы і групы Лі, алгебраічныя і лінейныя групы. У кожнай з гэтых галін маладому даследчыку належаць глыбокія вынікі, якія маюць фундаментальнае значэнне. Яны атрымалі прызнанне як у нашай краіне, так і за яе межамі. За кансультацыямі да Уладзіміра Пятровіча звяртаюцца члены акадэмій іншых краін, лаўрэаты Нобелеўскай прэміі. Пяру прафесара належыць 50 навуковых прац, звыш 20 з якіх пераведзены на замежныя мовы. Па прапанове АН СССР і Маскоўскага матэматычнага таварыства ім напісан шэраг артыкулаў аглядавага характару. Значныя заслугі У. П. Платонава ў развіцці матэматыкі ў Беларусі. Яны заключаюцца ў правядзенні і арганізацыі даследаванняў па такіх напрамках, якіх раней не было ў рэспубліцы. Нельга не адзначыць яго заслугі ў папулярызацыі матэматыкі сярод школьнікаў Беларусі. Ён з'яўляецца арганізатарам першай школы матэматыкаў, пастаянным членам аргкамітэта Усебеларускай школьнай матэматычнай алімпіяды.

Антон Нікіфаравіч Сеўчанка і ўноў выбраныя члены-карэспандэнты АН БССР Л. В. Валадзько, І. М. Лушчыцкі, Р. Л. Старобінец, У. П. Платонаў (на здымках зверху ўніз) атрымалі шмат віншавальных пісьмаў і тэлеграм, у якіх выказваецца пажаданне далейшых поспехаў у навукова-даследчай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці. Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» і яе студэнцкі актыў далучаюцца да гэтых шчырых віншаванняў.



# АГІТПУНКТ ГАСЦІННА РАСЧЫНІЎ ДЗВЕРЫ

Адразу ж пасля апублікавання Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб выбарах у мясцовыя Саветы ў парткоме адбылася нарада актыву, на якой былі вызначаны канкрэтныя задачы па арганізацыі масава-палітычнай работы сярод насельніцтва. А праз некалькі дзён у біялагічным корпусе гасцінна расчыніў дзверы агітпункт выбарчага участка № 1, а агітатары адправіліся па дамах к выбаршчыкам з цікавымі гутаркамі, запрашэннямі наведаць універсітэт, дзе іх чакаюць лектары, кансультанты, самадзейныя артысты, сустрэчы з вучонымі.

Вялікая заслуга ў гэтым галаўной партарганізацыі — партарганізацыі гістфака. Камуністы факультэта, нягледзячы на тое, што многа ўвагі аддавалі завочнікам, удзялялі нямала часу рабоце агітпункта, агіткалектыву. Не выпадкова іх вопыт прыцягнуў увагу многіх студэнтаў-завочнікаў — ім жа таксама, вярнуўшыся дамоў, прыйдзецца ўключыцца ў гэтую важную палітычную кампанію. Яны азнаёміліся з планамі індывідуальнай і масавай работы, тэматыкай лекцый і гутарак, распарадкам дня агітпункта...

У агітпункце па-сапраўднаму ўтульна. На сталах свежыя газеты, часопісы. Ёсць бібліятэчка выбарчай літаратуры, на сценах — картасхема раёна першага выбарчага ўчастка, графік дзяжурства агітатараў, план работы. Выбаршчыкі могуць унесці свае прапановы, пажаданні — у агітпункце заведзена кніга для гэтай мэты, яе штодзённа праглядае загадчык.

Вялікі калектыў агітатараў— 54 чалавекі. Гэта ў асноўным камуністы, камсамольцы, людзі, якія маюць вялікі вопыт передвыбарчай работы. Але ёсць і навічкі, галоўным чынам з ліку аспірантаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў. У старэйшых таварышаў яны атрымліваюць парады, адказы на хвалюючыя пытанні, і ўсе разам абмяркоўваюць свае праблемы на нарадах і семінарах. Ужо адбылося некалькі такіх сустрэч. На адной з іх з дакладам «Формы і метады агітацыйна-масавай работы з выбаршчыкамі» выступіў сакратар партбюро гістфака дацэнт А. І. Кажушкоў.

Загадчык агітпункта аспірант кафедры гісторыі КПСС камуніст І. Д. Стадуб расказвае, што многія агітатары ўжо правялі па месцу жыхарства выбаршчыкаў па некалькі гутарак на палітычныя тэмы. Складзены і папярэднія спісы выбаршчыкаў. А наперадзе — мноства цікавых мерапрыемстваў. Дарэчы, партком і рэктарат стварылі добрыя ўмовы для работы. Пры агітпункце ёсць клуб са стацыянарнай кінаўстаноўкай, тут жа будуць праводзіцца сходы выбаршчыкаў, перад імі выступяць лектары, вучоныя раскажуць аб развіцці навуковых даследаванняў, падрыхтоўцы кадраў. У плане — сустрэчы з пісьменнікамі, з ветэранамі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, перадавікамі вытворчасці, спартсменамі-алімпійцамі. Усяго не пералічыш. Героі Савецкага Саюза А. А. Філімонаў, Д. П. Жмуроўскі, былы камандзір партызанскай брыгады дэпутат Вярхоўнага Савета БССР В. І. Лівянцоў раскажуць аб подзвігах савецкіх людзей у барацьбе з гітлераўскімі захопнікамі. Змястоўны даклад на тэму «Дасягненні беларускага народа за 50 год» падрыхтаваў дацэнт І. І. Трухан. У госці да выбаршчыкаў прыйдуць вучоныя-юрысты (спецыяльна арганізуецца стол даведак і кансультацый), геолагі, вядучыя мінскія мадэльеры адзення, артысты.

А вось у плане агіткалектыву, які ўзначальвае малады выкладчык гістфака Н. І. Мініцкі, прыцягваюць увагу лекторыі і тэматычныя гутаркі. У лекторыі, прысвечаным 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, такія тэмы, як «У. І. Ленін — карыфей навукі», «У. І. Ленін — арганізатар і правадыр Камуністычнай партыі» і іншыя. Распрацавана тэматыка і па дасягненнях беларускага народа ў сацыялістычным і камуністычным будаўніцтве.

Р. КРЫНІЦКІ,
Л. ЗЕМЛЯКОЎ,
аспірант.



Наказ турыстам перад дарогай. Фота П. Бондара.

# ШТО ПАКАЗАЛА СЕСІЯ

Цяперашняя зімовая экзаменацыйная сесія, як і папярэдняя, была найбольш цяжкай. Гэтая цяжкасць звязана з тым, што студэнтам давялося нямала папрацаваць на сельскагаспадарчых работах і, нягледзячы на гэта, здаваць па пяцьшэсць экзаменаў.

У мінулыя гады фізічны факультэт не накіроўваў на сельскагаспадарчыя работы першакурснікаў, і гэта, відаць, было правільным рашэннем. У гэтым годзе адрыў студэнтаў першага курса ад вучобы на месяц прывёў да перагрузкі вучэбнымі заняткамі. Адчулася і цяжкасць пераходу ад школьнай сістэмы навучання да вышэйшай. У выніку панізіліся поспехі зімовай сесіі на першым курсе аддзялення фізікаў.

Аднак у цэлым сесія прайшла паспяхова. Павысіўся працэнт студэнтаў, якія займаюцца на добра і выдатна. Экзаменацыйную сесію здавала больш 1800 студэнтаў дзённага аддзялення. З іх больш 200 чалавек атрымалі выдатныя вынікі, добрыя і выдатныя — больш 750, здавальняючыя і добрыя — 770 і нездавальняючыя вынікі паказалі больш 110 чалавек. Прычым найбольшы працэнт нездавальняючых адзнак выпадае на студэнтаў малодшых курсаў аддзялення фізікі.

У пераважнай большасці студэнты скардзяцца, што многа часу затрачана на выкананне дамашніх заданняў па замежнай мове і састаўленне канспектаў па работах класікаў марксізма-ленінізма. У выніку на самастойную работу па спецыяльных дысцыплінах не застаецца часу.

Сярод малодшых курсаў лепшую паспяховасць паказалі патокі радыёфізікаў першага — другога курсаў. На аддзяленні радыёфізікі больш 80 працэнтаў першакурснікаў здалі экзамены на добра і выдатна. Трэба сказаць, што студэнты-радыёфізікі абвергглі довад аб тым, што перыферыйныя школы даюць больш слабую падрыхтоўку. Набор 1968 года, у асноўным, з перыферыйных школ Беларусі.

Асноўная маса студэнтаў як узяла выдатны старт з першага семестра, так і працягвае ўтрымліваць яго на працягу ўсяго перыяду навучання. Да такіх студэнтаў адносяцца Е. Ціткоў — ленінскі стыпендыят, А. Чайкоўскі, О. Коган, І. Шмідаў, С. Вінакураў, Н. Клюканава, А. Мінько, Ю. Макараў, А. Кульба, С. Сакалоў, Г. Сіцко, І. Ташлыкоў, Е. Ерамеева і многія іншыя. Аднак ёсць і такія студэнты, якія лічаць, што можна вучыцца на два і тры, перапаўзаючы з вялікай цяжкасцю з курса на курс. Гэта трэцякурснікі Г. Балоцін, Л. Таранюк, Л. Аўсянская, В. Бачкароў, студэнты IV курса Г. Антонаў, Э. Курашэвіч, В. Пронь, Г. Гаршкоў, В. Абрамчык, С. Кліменка, Ю. Шутаў і іншыя.

У заключэнне хочацца падкрэсліць, што галоўнай прычынай непаспяховасці з'яўляецца няўменне, а падчас і нежаданне некаторых студэнтаў сістэматычна самастойна працаваць.

Е. ПІСКУНОЎ.

# СЯБРЫ СУСТРАКАЮЦЦА Ў ВІЛЬНЮСЕ

*У спартсменаў нашага універсітэта ўжо даўно ўстанавіліся сяброўскія сувязі са спартсменамі прыбалтыйскіх рэспублік. Штогод праводзяцца матчавыя сустрэчы па розных відах спорту.*

*З 25 па 28 студзеня ў горадзе Вільнюсе адбыліся гульні валейбалістаў Вільнюскага, Рыжскага і нашага універсітэтаў. У спаборніцтвах прымалі ўдзел мужчынскія і жаночыя каманды.*

*У першы дзень сустракаліся каманды Вільнюскага і нашага універсітэтаў. Спачатку на пляцоўку выйшлі мужчынскія каманды. Сілы іх прыкладна роўныя. Упартая барацьба працягвалася звыш дзвюх гадзін. Спрэчку вырашыла пятая партыя, якую з лікам 15:9 выйгралі нашы студэнты.*

*Затым на пляцоўку выйшлі каманды дзяўчат. Літоўскія спартсменкі стараюцца ўзяць рэванш за пройгрыш рабят і засыпаюць нашу каманду абманлівымі ўдарамі. Нашы дзяўчаты ніяк не могуць прынаравіцца да хуткай манеры ігры саперніц. У выніку мы праігрываем дзве партыі, але ў трэцяй нашы дзяўчаты здолелі наладзіць арганізацыю блакіравання, і ўдары літоўскіх валейбалістак усё менш дасягаюць мэты. Гэта натхніла нашу каманду. Тры апошнія партыі выявілі перавагу беларускіх спартсменак. Цяжкая, але пачэсная перамога!*

*На наступны дзень нашымі сапернікамі былі каманды Рыжскага універсітэта. Ігра мужчынскіх каманд праходзіла з пераменным поспехам. Спрэчку зноў вырашыла толькі пятая партыя, якую выйгралі нашы рабяты. На адну выйграную партыю рыжанак нашы дзяўчаты адказалі трымя. У гэтай гульні найбольш удала праявіла сябе студэнтка першага курса матфака Ларыса Дубовік.*

*Спаборніцтвы закончыліся. Удзельнікі раз'язджаюцца і развітваюцца да наступнага года, калі традыцыйныя спаборніцтвы будуць праводзіцца ў Мінску.*

*М. КУЧЫНСКІ.*

# ПЕРШЫНСТВО ПА ХАКЕЮ

**Каманда спортклуба БДУ сыграла ўсе гульні першага тура першынства горада сярод вну па хакею і ідзе без паражэнняў. Вельмі важныя перамогі атрыманы над камандай тэхналагічнага інстытута — удзельніцай першынства рэспублікі — з лікам 7:0 і камандай політэхнічнага інстытута з лікам 4:2.**

**Асабліва трэба адзначыць ігру студэнтаў В. Сумцова (гістфак), О. Сявідава (юрфак), В. Бураўскага (біяфак), Л. Барэйка, В. Рокшына (геафак) і А. Какорына (супрацоўнік БДУ).**

**Нашы ігракі поўныя жадання папоўніць лік перамог і ў першынстве вну рэспублікі.**

**Г. Лінкевіч.**

*Па слядах нашых выступленняў*

# «ЯК ТАБЕ ЖЫВЕЦЦА?»

Пад такім загалоўкам у 35 нумары нашай газеты ад 13 снежня 1968 года быў змешчан матэрыял рэйдавай брыгады, якая пабывала ў новым студэнцкім інтэрнаце па вуліцы Кастрычніцкай.

За гэты час у інтэрнаце адбылося нямала прыемных змен. Вельмі добра аформлен ленінскі пакой. Тут пастараліся гаспадары— студэнты хімічнага і матэматычнага факультэтаў. Яны падрыхтавалі цікавыя стэнды, прысвечаныя юбілеям рэспублікі і Кампартыі, а таксама 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, — «Живее всех живых». Святлей і ўтульней стала ў трох абсталяваных тут чытальных залах.

На пасяджэнні студсавета зацверджан план палітыка-выхаваўчай работы.

Як паведаміў новы камендант Уладзімір Патапавіч Цурко, ліквідаваны сур'ёзныя бытавыя непаладкі. У кухнях на ўсіх паверхах з'явіўся газ, гатовы да пуску ліфт, наведзена чысціня ў падсобных памяшканнях.

Асаблівая ўвага звернута на ўмацаванне дысцыпліны. Ва ўсіх пакоях і на ўсіх паверхах выбраны старасты— ініцыятыўныя і дысцыплінаваныя студэнты.

Ёсць усе падставы спадзявацца, што гэты інтэрнат стане адным з лепшых.

# ВЕСНІК У ДОБРЫ ШЛЯХ!

*Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна*

Выйшаў у свет першы нумар новага навуковага часопіса «Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна».

Выданне часопіса адкрывае серыя «Гісторыя, філасофія, эканоміка, права». Гэта лагічна і знамянальна. Грамадскія навукі адыгрываюць вялікую ролю ў працы і жыцці савецкага народа, іх значэнне ў камуністычным будаўніцтве павышаецца з году ў год. І вучоныя універсітэта ўносяць вялікі ўклад у развіццё гэтых галін навукі. У БДУ працуюць апорныя кафедры па вядучых спецыяльнасцях. Толькі за апошнія месяцы іх супрацоўнікамі надрукавана каля дваццаці кніг, сярод якіх манаграфіі В. М. Панкратава «Дыялектыка станаўлення і развіцця камуністычнай фармацыі», М. Р. Круцько «Рэформы і рэвалюцыя», К. К. Германа «Вядучая роля рабочага класа ў стварэнні калгаснага ладу ў Беларусі», В. А. Молакава «Філасофія сучаснага праваслаўя», А. А. Галаўко «Дзейнасць Саветаў Беларусі па здзяйсненню эканамічнай палітыкі ў вёсцы ў 1927—1936 гг.», А. С. Кляўчэні «Стэфан Рудлянскі» і іншыя. Масавым тыражом пад рэдакцыяй прафесараў У. М. Сікорскага і М. Я. Шкляра выходзіць у свет курс лекцый па гісторыі КПСС.

Аб гісторыі развіцця даследаванняў па грамадскіх навуках ва універсітэце і сучасным становішчы ў гэтай справе чытач даведаецца, пазнаёміўшыся з друкуемымі ў часопісе артыкуламі П. З. Савачкіна «Развіццё навукі на гістарычным факультэце», А. С. Кляўчэні і Р. А. Левіна «Развіццё філасофскай думкі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце», Г. А. Павецьева і І. А. Юхо «Развіццё юрыдычнай навукі ў БДУ» і іншымі матэрыяламі, змешчанымі пад рубрыкай «Да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна і 50-годдзя БССР і КПБ». Няма неабходнасці пераказваць гэтыя цудоўныя рапарты аб выдатных дасягненнях універсітэцкіх вучоных, але не магу ўтрымацца, каб не прывесці некалькі фактаў. Толькі за апошнія пяць гадоў на гістфаку было абаронена 15 дысертацый, з іх 6 доктарскіх, пяць яшчэ гатовы для сур'ёзнага экзамену. А хіба ж не парадуюць кожнага з нас такія лічбы: за перыяд свайго існавання (з 1947 года, быў і перапынак) філасофскае аддзяленне БДУ выпусціла 106 спецыялістаў, 42 з іх абаранілі кандыдацкія дысертацыі! Такіх прыкладаў у артыкулах прыведзена нямала, і кожны аўтар адзначае, што ўсімі сваімі поспехамі беларускі народ абавязан Леніну, партыі, Савецкай уладзе. Не выпадкова часопіс адкрываецца змястоўнай працай прафесара М. Я. Шкляра «У. І. Ленін — арганізатар Кампартыі Беларусі». З цікавымі фактамі і абагульненнямі чытач пазнаёміцца і ў артыкулах дацэнта Ю. П. Броўкі «Да пяцідзесяцігоддзя знешнепалітычнай дзейнасці Беларускай ССР», дацэнта І. О. Царук «Аб некаторых асаблівасцях культурнага будаўніцтва ў заходніх абласцях Беларусі».

Па праблемах філасофскіх навук, акрамя ўжо названага намі артыкула нарысавага характару, у часопісе змешчаны яшчэ два — доктар філасофскіх навук Р. А. Левін і дацэнт Я. В. Петушкова выступаюць па пытаннях ленінскай тэорыі пазнання. Думаецца, гэта таксама не выпадкова. Ужо ў першыя гады існавання універсітэта тут пачалі распрацоўвацца важныя праблемы дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму. У нашым універсітэце быў напісаны першы ў краіне падручнік па дыялектычнаму матэрыялізму, дапаможнік, па якому вучыліся многія пакаленні студэнтаў. Цяпер на кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі працуе вялікі калектыў вучоных, якія даследуюць актуальныя пытанні, у прыватнасці па ленінскай тэорыі адлюстравання. Значныя поспехі — у кафедры гісторыі філасофіі і логікі, дзе да таго ж вывучаюцца праблемы навуковага атэізму, этыкі, эстэтыкі.

У часопісе шырока прадстаўлен раздзел навуковага камунізма. На фактах апошніх год, з багатым выкарыстаннем замежных літаратурных крыніц пабудаван артыкул загадчыка кафедры дацэнта М. Р. Круцько на тэму «Прамысловая дэмакратыя — зброя барацьбы супраць манаполій». Г. Я. Галенчанка выступае з даследаваннем сучасных форм стачачнай барацьбы пралетарыяту ў развітых капіталістычных краінах. Сюды можна далучыць і артыкулы М. Г. Жаркова «Заходнегерманскі «Остфоршунг» на службе антыкамунізму» (аб фальсіфікатарах гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі) і Г. Г. Цернавога і О. С. Цернавой «Антыкамунізм пад маскай «дэмакратычнага сацыялізма». Яны надрукаваны пад рубрыкай «Крытыка буржуазнай ідэалогіі».

Больш за ўсіх работ прадставілі юрысты. Асноўная ў іх — беларуская тэматыка. Так, прафесар Ф. І. Гаўзе прысвячае сваё выступленне такому важнаму пытанню, як гаспадарчае будаўніцтва БССР у 1921—1925 гг. і рэвалюцыйная законнасць, дацэнт І. С. Цішкевіч асвятляе слаба распрацаваныя ў юрыдычнай навуцы праблемы прававой ацэнкі дзеянняў грамадзян, накіраваных на спыненне злачынных замахаў і затрыманне злачынца. Аб артыкуле Ю. П. Броўкі мы ўжо гаварылі. Юрысты даюць рэцэнзію на новы падручнік «Адміністрацыйнае права», які выдадзен у Маскве ў 1968 годзе.

У аддзеле «Крытыка і бібліяграфія» змешчана таксама падрабязная рэцэнзія на кнігу былога выпускніка філасофскага аддзялення БДУ, цяпер супрацоўніка АН БССР А. І. Галаўнёва «Нацыянальная культура і камунізм».

Мы так падрабязна спыніліся на гэтым нумары новага навуковага беларускага часопіса наўмысна. Папершае, ён — першы, першая ластаўка і, шчыра кажучы, патрабуе падтрымкі, прыцягнення шырокага кола чытачоў. Рэдакцыйная калегія, несумненна, падрыхтавала цікавы па зместу і разнастайны па тэматыцы нумар. Прычым, і гэта трэба падтрымаць, ён разлічан не толькі на выкладчыкаў, студэнтаў, але і на шырокую грамадскасць. Праўда, не ўсе аўтары змаглі вытрымаць строгія патрабаванні рэдкалегіі адносна стылю, даходлівасці мовы. Разам з тым у некаторых месцах папулярнасць зроблена за кошт зніжэння тэарэтычнага ўзроўню. Гэта патрэбна ўлічыць пры падрыхтоўцы наступнага нумара.

Па-другое, рэдакцыйная калегія ў сваім звароце да чытачоў заяўляе, што новы часопіс «мае асабліва вялікую патрэбу ў сяброўскіх заўвагах, водгуках, парадах, прапановах». Што ж, ужо зыходзячы з першага нумара, можна выказаць шэраг заўваг і пажаданняў. Хацелася б, каб у часопісе былі прадстаўлены не толькі чатыры асноўныя раздзелы (гісторыя, эканоміка, філасофія, права) і тры пастаянныя рубрыкі (крытыка і бібліяграфія, навуковае жыццё, супраць буржуазнай ідэалогіі). Магчыма, яшчэ трэба падумаць над фармулёўкамі і зместам рубрык. Ды іх і мала. Здаецца, напрыклад, мэтазгодным сістэматычна друкаваць кароткія матэрыялы пад рубрыкамі «Сёння на кафедрах», «Новыя даследаванні», «Міжнародныя сувязі», «Аб нас пішуць», «Адказваем на тваё пытанні, чытач». Прапанаваная рэдкалегіяй рубрыка «Навуковае жыццё» ніколі не ахопіць усе гэтыя пытанні.

І яшчэ аб адным хацелася б сказаць асобна. У мінулым годзе ва універсітэце адбылася рэспубліканская канферэнцыя па праблемах методыкі выкладання грамадскіх навук. На канферэнцыі прама гаварылася, што ў гэтым пытанні ў нас шмат недахопаў, па сутнасці робяцца толькі першыя крокі (дарэчы, днямі ў Маскве адбылася першая ўсесаюзная канферэнцыя, першая!). І разам з тым на агульнауніверсітэцкіх кафедрах накоплен станоўчы вопыт, яго патрэбна развіваць, прапагандаваць. Абавязак апорных кафедр дапамагчы выкладчыкам перыферыйных вышэйшых навучальных устаноў. Дык чаму ж у часопісе не завесці пастаянную рубрыку па гэтаму злабадзённаму пытанню? Мабыць, дзесяткі і сотні людзей скажуць за такія матэрыялы дзякуй. І справа не толькі ў гэтым. Часопіс не павінен ператварацца ў інфармацыйны бюлетэнь ці звычайны зборнік навуковых артыкулаў. Могуць запярэчыць: само слова «Веснік» схіляе да такога напрамку. Думаецца, справа не ў назве. Гэта — навуковы часопіс, часопіс, падкрэсліваем, і, як любы орган перыядычнага друку, ён павінен быць баявым прапагандыстам, агітатарам і арганізатарам. Менавіта першым нумарам такая заяўка і зроблена. Дык у добры шлях!

У. БЛАКІТНЫ.

# ПЯЮ МАЮ РЭСПУБЛІКУ

# ПЕРАКЛІЧКА ПАКАЛЕННЯЎ



*Край легенд,*
*адвечных песень-казак,*
*край паэм —*
*бальзам жывых крыніц...*
*Край балот,*
*тугі азёраў наскіх,*
*край цішы*
*і громаў-навальніц...*
*Край лясоў,*
*мінулых дзён паўстання,*
*край нізін —*
*прастораў дальніх шыр...*

*ПАЎЛЮК ТРУС*

*Край палёў...*
*О, край,—*
*калі ж ты станеш*
*краем фабрык дымных*
*і машын?..*

*ПЯТРО ГЛЕБКА*

## ДНІ СУЧАСНАСЦІ

**Дні вялікай сучаснасці**
**Нашы бурныя дні!**
**У праменнях, у яснасці,**
**У святочным агні.**
**Бачу вас, залацістыя,**
**Праз гады і вякі.**
**Вас спаўюць у квяцістыя,**
**У жывыя вянкі.**
**Вас аздобяць паданнямі**
**Нашых дум і трывог.**
**Вы багаты змаганнямі**
**І красой перамог.**
**Вы геройствам адзначаны**
**Небывалых падзей.**
**Вы крывёю аплачаны**
**Нашых лепшых людзей.**
**Пралятаеце выраем**
**Насустрэчу вякам,**
**Многа радасці шчырае**
**Пакідаючы нам.**
**І трывогіназолія**
**Нашых душ не змаглі:**
**Усё так жа вясёлыя**
**Мы ідзём па зямлі.**
**А прыляжам, канаючы,**
**На дарожны пясок,**
**Скалыхнецца, рыдаючы,**
**Кожны куст і лясок.**
**Шчыра выплачуць росамі**
**Горкі смутак і жаль,**
**З маладымі бярозамі**
**Зноў загледзяцца ў даль.**
**Там пракладзенай сцежкаю**
**На прасторы вясны**
**З нашым гартам і ўсмешкаю**
**Выйдуць нашы сыны.**
**Вы ніколі не згаснеце —**
**Ні пры нас, ні пры іх,**
**Дні вялікай сучаснасці,**
**Дні трывог баявых.**

## МАЦІ

*ПЯТРУСЬ БРОЎКА*

Ты ходзіш, маці, сцежкамі вайны,
І з вуснаў рвуцца ворагам праклёны.
З братамі пройдзём мы, твае сыны,
І выйдзе Беларусь з палону!
Рабуе гвалтаўнік апошняе з двара,
Цябе давесці хоча ён да скону,
Ды грозная помсты блізіцца пара,
І выйдзе Беларусь з палону!
Крывёй звяроў напоўнім берагі,
Касцямі катаў высцелем затоны,
Ударым мы —парвуцца ланцугі,
І выйдзе Беларусь з палону!
Не раз мы зносілі насланую бяду,
Не раз знішчалі мы драпежнікаў шалёных;
Змяце зямля і гэтую брыду,
І выйдзе Беларусь з палону!

## СПІРЫДОНАЎ ГЕОРГІЙ МАКСІМАВІЧ



Дэканат, партыйная і прафсаюзная арганізацыі фізічнага факультэта з глыбокім жалем паведамляюць, што 2 лютага 1969 г. на 75 годзе пасля непрацяглай хваробы памёр асістэнт кафедры агульнай фізікі Георгій Максімавіч Спірыдонаў. Усё жыццё Георгія Максімавіча было яскравым прыкладам беззапаветнага служэння Радзіме і савецкаму народу. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, Георгій Максімавіч прысвяціў усё сваё жыццё справе барацьбы за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы, справе пабудовы сацыялізма і камунізма.

Георгій Максімавіч Спірыдонаў займаў шэраг адказных пасад—начальніка ўчастка будаўніцтва Тульскага аружэйнага завода, начальніка ўчастка будаўніцтва «Уралмашбуда» і «Магнітбуда», начальніка лабараторыі ЦАГІ, намесніка наркома мясцовай прамысловасці БССР

Дзе б ён ні працаваў, усюды праяўляў выключную працаздольнасць, прынцыповасць, сціпласць. Партыя і Савецкі ўрад адзначылі яго заслугі перад Радзімай шэрагам ўрадавых узнагарод. Знаходзячыся з 1961 года на персанальнай пенсіі, Георгій Максімавіч працягваў працаваць асістэнтам кафедры агульнай фізікі, аддаючы ўсе свае веды і багаты жыццёвы вопыт справе навучання і камуністычнага выхавання моладзі.

Светлая памяць аб Георгію Максімавічу назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

Дэканат,
партбюро,
прафбюро
фізічнага факультэта.

*АЛЕСЬ ЗВОНАК*

## ПОМНІК ЛЕНІНУ

*Адліты ў бронзы нерухомасць,*
*З узлётам мужнае рукі,—*
*Такім народная свядомасць*
*Яго запомніць на вякі!*
*А побач гмах на люднай плошчы*
*Асветлен сонцам веснавым,*
*І вецер горды сцяг палошча*
*Над родным горадам маім.*
*Яго дамы, яго палацы,*
*Граніт і мармур, сталь і шкло —*
*Усё, што ў ім красою працы*
*З руін і вогнішч ажыло.*
*То над сатлелым папялішчам*
*Разбегам вуліц, плошчаў, трас*
*Паўстала светлая сталіца —*
*Масквы малодшая сястра.*
*Тут верны ленінскаму слову,*
*На ясны выйшаўшы прасцяг,*
*Вяршыць народ на роднай мове*
*Закон шчаслівага жыцця.*
*Усё яго — зямля і рэкі,*
*Што адстаялі ў грозны час,—*
*Усё спалучана навекі*
*З вялікім імем Ільіча!*

*МІКОЛА ХВЕДАРОВІЧ*

## РОДНЫЯ ВОБРАЗЫ

**Мы ездзім далёка за мора**
**чужыя глядзець гарады,**
**шукаем скалістыя горы,**
**азёры крыштальнай вады.**
**І часта, так часта бывае,**
**што мы ў сумятлівым жыцці**
**мінаем і не заўважаем**
**красу сваіх родных мясцін,**
**свае гарады і пасёлкі,**
**амытыя ласкай вятроў,**
**і подых сасновае смолкі**
**сівых беларускіх бароў...**
**А той, хто Палесся не бачыў,**
**хто ў Пінску ні разу не быў,**
**на Прыпяці хто не рыбачыў,**
**не плыў у вясенні разліў,—**
**не зведаў красу свайго краю.**
**Скажу я вам праўду адну:**
**заморскія вёсны, я знаю,**
**не лепей за нашу вясну.**
**Калі разліюцца паводкі —**
**бярозы па грудзі ў вадзе,**
**як белыя тыя лябёдкі**
**на воду сышлі кагадзе.**
**На ветры румяным і золкім**
**іх сёстры стаяць на груду,**
**дзявочага шчасця пярсцёнкі**
**раняюць яны на ваду.**

**А скрозь цішыня веснавая.**
**І там, дзе мігціць небакрай,**
**сясцёр сваіх родных гукае**
**бярозак спалоханы гай.**
**Вось так яно часам бывае,**
**што мы ў сумятлівым жыцці**
**мінаем і не заўважаем**
**красу сваіх родных мясцін.**

*РЫГОР БАРАДУЛІН*

## НА ЦАЛІНУ

Вагон таварны дрогка тузае.
Гарыць трапётка стэарын.
Там жарты заглушае музыка,
Тут многіх сон паспеў скарыць.
Абапал—па дарожных правілах—
Слупы з падпорамі — ў струну,
Бы плечы два сябры падставілі,
Каб трэці мог далей зірнуць.

А вецер, дым над дахам сцелючы,
Праводзіць у далёкі шлях,
Ды нам на шчасце, з поўным, Велічна
Дарогу Волга перайшла...

*АЛЯКСЕЙ ПЫСІН*

## НЕЗАБЫЎНАЕ

Палім мы маршанскую махорку,
Бачым мы Дняпроўскую граду.
Будзе сёння бой. На тым узгорку
Можа я таксама упаду.
Будуць травы над курганам. Будуць
Адлятаць у вырай жураўлі.
Нас, напэўна, ў свеце не забудуць,
Успомняць, што на свеце мы жылі.
...Я гляджу на даўняе кургане,
На траву, на рыжых мурашоў.
Ведайце: калі мяне не стане—
Я ў сваю дывізію пайшоў.

*АЛЕГ ЛОЙКА*

## СЛАВА ВАМ, САЛДАТЫ

Пражытае — не памяці рубцы
І не ўспамінаў вохкая трывога,
Яно—са мной навечна, як байцы,
Што неслі ў сорак пяты перамогу;
Яны мяне ў сыры хавалі склеп,
Каб не забіла куля-шаляніца,
Біклагі напаўняючы крыніцай,
Нам пакідалі свой салдацкі хлеб;
Ён порахам усіх франтоў прапах...
Акраец беручы, штодня і сёння,
Здаецца мне, бяру яго з далоняў,
Што развіналі перамогі сцяг;
Няхай сваім крылом ён ахіне
І будучыню!..
Слава вам, салдаты,
Што Перамогі дзень узнеслі датай
Другога дня радзін не толькі мне!
Як галубы, над намі самалёты,
Блакіт з азёраў, рэк— не пераліць,
Вясна сцягі зялёныя лістоты
Спяшаецца з пупышак расчахліць,—

І гэтак будзе — будзе з году ў год,
А тых байцоў ніколі не забудзем,
Пакуль на гэтым свеце жыць мы будзем,
Пакуль жыць будзе чалавечы род!

І гэтак будзе, бо праз нас прайшлі,
Трымаючы ля сэрцаў аўтаматы,
Байцы, што пакідалі хлеб па хатах,
Мір несучы навечна ўсёй зямлі!..

*МІКОЛА АЎРАМЧЫК*

## «ПОЛЫМЮ»

**Перад табой**
**я кланяюся нізка**
**За тое,**
**што ў бацькоўскай старане**
**Адну сваю малюсенькую іскру**
**Закінула калісь**
**ты ў сэрца мне.**
**Калі я быў далёка ад айчыны,**
**Дзе не магло сагрэць тваё цяпло,**
**І ў сне,**
**і ў час трызнення прад вачыма**
**Мігала кожны раз тваё святло.**
**Там, пад зямлёй,**
**сярод шматмоўных плыняў,**
**Што ў цемры**
**шлях шукалі да святла,**
**Быў кропляй я**
**ў халоднай ручаіне,**
**Якая да агню твайго цякла.**
**Пасля**
**я да цябе туліўся блізка,**
**Не рукі грэў табою —**
**не хлушу,—**
**Я кожнаю тваёй маленькай іскрай**
**Адаграваў настылую душу.**
**Ад іскры Ільічовае, навечна**
**Запаленае думкай землякоў.**
**Ты не датлееш памінальнай свечкай**
**Па мове нашых матак**
**і бацькоў.**

Пераклічку пакаленняў паэтаў, якія ў свой час былі студэнтамі БДУ, падрыхтавалі трэцякурснікі журфака Васіль ШЫРКО і Генадзь ПАШКОЎ.

*Парады ўрача*

## ЯК ЗБЕРАГЧЫСЯ АД ГРЫПА

**Грып — інфекцыйнае захворванне. Перыядычна ўзнікаюць эпідэміі грыпа, якія ахопліваюць вялікія групы людзей. Кожная з такіх эпідэмій дае цяжкія ўскладненні і прыводзіць да смерці многіх. Выклікаюць грып вірусы, якія маюць многа разнавіднасцей.**

**Цяперашні грып выклікаецца разнавіднасцю «ганконг». Працяг хваробы звычайна бурны: высокая тэмпература, галаўная боль, ламата ва ўсім целе, боль у мышцах, у суставах. Катаральныя з'явы—кашаль, насмарк —бываюць не заўсёды. Бывае, што грып працякае з нармальнай тэмпературай. Хвароба працягваецца 5—7 дзён. У аслабленых людзей, у сталым узросце і ў дзяцей даволі часта бываюць ускладненні (запаленне лёгкіх, сардэчная слабасць). Грып выклікае абвастрэнне хранічных захворванняў (туберкулёз, рэўматызм).**

**Як адбываецца заражэнне! Пры размове, кашлі, чыханні хворы сее вакол сябе інфекцыю. Заражэнне адбываецца і праз насавыя хусцінкі, палаценца, пасуду хворага.**

**Захварэўшага грыпам неабходна пакласці ў пасцель, лепш у асобны пакой, або адгарадзіць шырмай яго ложак. Да хворага трэба выклікаць урача.**

**У час хваробы неабходна прытрымлівацца правільнай дыеты, ужываць лёгказасвайваемую страву і дастатковую колькасць вадкасці. Вельмі карысныя гародніна і садавіна, якія ўтрымліваюць вялікую колькасць каштоўных спажыўных рэчываў і вітамінаў, што дапамагаюць арганізму ў барацьбе з інфекцыяй.**

**Каб папярэдзіць грып, неабходна рэгулярна праветрываць жылыя і службовыя памяшканні, мыць падлогу са слабым растворам хлорнай вапны. Моцны, закалены арганізм лепш супрацьстаіць інфекцыі, таму неабходна займацца спортам, больш бываць на свежым паветры.**

**На жаль, часта можна чуць ад хворых аб розных «універсальных» сродках, якія нібы дапамагаюць пазбавіцца ад грыпа. Так, гавораць аб гарэлцы, аб моцных вінах. Гэта, вядома, няправільна. Моцныя віны шкодны нават і здароваму чалавеку.**

Ф. РЭЗНІКАВА.

Адказны рэдактар М. І. ІОСЬКА.